КАНФЕРЭНЦЫЯ НОВАЯ БЕЛАРУСЬ 2025

Рэзалюцыя

# Еўрапейскі выбар Беларусі і падрыхтоўка дарожнай карты інтэграцыі ў ЕС

Мы, Дэмакратычныя сілы Беларусі,

***Пацвярджаем:***

— Будучыня Беларусі — у Еўрапейскім Саюзе. Гэта геапалітычны выбар, які гарантуе беларусам і беларускам свабоду, годнасць і дабрабыт.

— Нягледзячы на спробы рэжыму Лукашэнкі адарваць Беларусь ад Еўропы, беларускае грамадства захоўвае вернасць еўрапейскім каштоўнасцям — дэмакратыі, правам чалавека, вяршэнству права.

— Беларусь была і застаецца часткай еўрапейскай цывілізацыі. Сёння гэты выбар — альтэрнатыва не толькі «рускаму міру», але і палітычнай залежнасці, рэпрэсіям і эканамічнаму тупіку.

***Падкрэсліваем:***

— Еўрапейская інтэграцыя Беларусі з'яўляецца стратэгічным укладам у бяспеку рэгіёна, стрымліванне расійскага ўплыву і абарону дэмакратыі ва Усходняй Еўропе.

— У 2023 годзе мы афіцыйна абвясцілі пра еўрапейскую перспектыву праз "Дэкларацыю аб сяброўстве Беларусі ў ЕС" і з таго часу паслядоўна набліжаем нашу краіну да Еўропы — праз экспертызу, партнёрствы і дыпламатыю.

— Прыняццё Каардынацыйнай Радай "Мемарандума аб адмене смяротнага пакарання ў Беларусі", падтрыманага ОСЦ, АПК, грамадзянскімі і праваабарончымі арганізацыямі - гэта першы крок да будучага ўступлення Беларусі ў Раду Еўропы.

***Вітаем:***

— Падпісанне Мемарандумаў аб супрацоўніцтве дэмакратычных сіл Беларусі з Еўрапейскім парламентам і Еўрапейскім эканамічным і сацыяльным камітэтам.

— Працу Кансультатыўнай групы Беларусь-ЕС, Кантактнай групы Рады Еўропы і Нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства.

— Стварэнне і працу дэлегацый дэмакратычных сіл Беларусі ў ПАРЕ і Кангрэсе мясцовых і рэгіянальных уладаў Рады Еўропы, якія складаюцца з дэлегатаў Каардынацыйнай Рады.

— Падтрымку ЕС грамадзянскай супольнасці Беларусі, незалежных СМІ і палітзняволеных.

***Абвяшчаем:***

— Пачатак падрыхтоўкі Дарожнай карты інтэграцыі Беларусі ў Раду Еўропы і ЕС.

— Гатоўнасць да правядзення Канферэнцыі высокага ўзроўню ЕС–

Беларусь як сімвалічнага і стратэгічнага кроку да збліжэння Беларусі з Еўрапейскім Саюзам.

— Пашырэнне партнёрства з нацыянальнымі парламентамі краін ЕС.

***Заклікаем:***

— Інстытуты ЕС і дзяржавы-члены ўзмацняць акадэмічныя, культурныя і інфармацыйныя абмены паміж ЕС і беларускім грамадствам.

— Прымаць меры для пераадолення візавых бар’ераў, абмежаванага прызнання кваліфікацый і палітычных перашкодаў, якія замінаюць беларусам удзельнічаць у праграмах мабільнасці ЕС.

— Беларусаў і беларусак ва ўсім свеце далучацца да прасоўвання еўрапейскага выбару праз удзел, навучанне і супольную дзейнасць.

Наша мэта — еўрапейская Беларусь. Беларусь, якая належыць сваім грамадзянам. Беларусь, якой ганарацца.

Еўрапейскі выбар — не мара, а будучыня, якую мы пачынаем будаваць ужо сёння. Ён патрабуе яснасці, паслядоўнасці і дзеянняў. Мы адкрытыя для супрацоўніцтва з усімі, хто гатовы зрабіць гэты выбар рэальнасцю.

*Прынята ў Варшаве, жнівень 2025 года*